Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (100), 2017

*УДК 272 (450)-9*

# Рускамоўная гістарыяграфія аб Каталіцкай царкве ў грамадска-палітычным жыцці Італіі (1943–1962 гг.)

А.Ф. Паддубская

Разглядаецца рускамоўная гістарыяграфія, прысвечаная пытанням ролі і месца Каталіцкай царквы ў грамадска-палітычным жыцці Італіі перыяду з моманту падзення рэжыму Мусаліні да пачатку II Ватыканскага сабору. Аналізуюцца асаблівасці савецкай і постсавецкай гістарыяграфіі па вызначанай тэме. Зроблены вывад аб актуальнасці далейшага вывучэння пытанняў, звязаных з дзейнасцю Каталіцкай царквы ў сучаным свеце.
**Ключавыя словы:** гістарыяграфія, каталіцызм, Ватыкан, Італія, пантыфікат.

The article deals with the Russian-language historiography on the issues of the role and place of the Catholic Church in the political life of Italy for the period since the fall of Mussolini's regime prior to Vatican II. The features of the Soviet and post-Soviet historiography regarding this topic are analyzed. The conclusion about the relevance of further study of issues related to the activities of the Catholic Church in the world is made.
**Keywords:** historiography, Catholicism, Vatican, Italy, pontificate.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Вось ужо дзве тысячы гадоў хрысціянства з'яўляецца адным з найважнейшых кампанентаў сусветнай гісторыі, які часта ўплывае на палітычнае, ідэалагічнае, а часам і эканамічнае развіццё чалавецтва.

Каталіцызм прэтэндуе на месца не толькі рэлігійна-духоўнага, але і маральнага, сацыяльнага, палітычнага аўтарытэту. Адыгрываючы вялікую ролю ў міжнароднай палітыцы, каталіцкая царква яшчэ ў большай ступені аказвае ўплыў на падзеі грамадска-палітычнага жыцця Італіі. У італьянскай дзяржаве традыцыйныя каталіцкія каштоўнасці шмат у чым вызначаюць гістарычныя тэндэнцыі. Само светаўспрыняцце італьянцаў складвалася ў вялікай ступені пад уплывам каталіцызму. Адбываецца і зваротнае ўздзеянне. Святому пасаду заўсёды прыходзілася ўлічваць складаныя працэсы, якія характарызавалі італьянскае грамадства.

Найбольшы інтарэс для аналізу ролі і месца каталіцкай царквы ў грамадска-палітычным жыцці Італіі прадстаўляюць першыя пасляваенныя гады да пачатку 1960-х гг., што сталі ў гісторыі каталіцызму паваротам да эпохі рэформ, звязаных з II Ватыканскім саборам. А менавіта з 1943 да 1962 гг., г. зн. з моманту падзення рэжыму Мусаліні да пачатку II Ватыканскага сабору. У дадзены перыяд перад царквой былі пастаўлены важныя пытанні: па-першае, неабходнасць прыстасавання да патрабаванняў новага пасляфашысцкага часу, па-другое, неабходнасць ўнутранай раўнавагі самой царквы і, па-трэцяе, умацаванне свайго ўплыву на грамадска-палітычнае жыццё краін як Еўропы, так і ўсяго свету (у тым ліку і Італіі).

Вось чаму, калі перад даследчыкам, што займаецца вывучэннем ролі і месца Каталіцкай царквы ў грамадстка-палітычным жыцці Італіі, паўстае першасная задача разгледзіць гістарыяграфію, якая дазволіць асэнсаваць акрэсленую тэму, то ў разлік патрэбна будзе ўзяць дастаткова разнастайныя па сваім паходжанні матэрыялы, створаныя гісторыкамі розных краін.

Праблема ролі і месца каталіцкай царквы ў грамадска-палітычным жыцці Італіі 1943–1962 гг. знайшла сваё адлюстраванне ў працах рускамоўных даследчыкаў. Гісторыя Італіі пасля падзення рэжыму Мусаліні, рух Супраціўлення аналізуецца ў працах Н.П. Камолавай, Ю.П. Лісоўскага, А.Г. Несцерава, А. Смірновай, Я. Токаравай, М.В. Устралава, Р.С. Філатава, М.М. Шэймана [1], [2], [3], [4], [5], [6], [7], [8], [9], [10], [11], [12], [13], [14].Працэсу станаўлення партыйнай сістэмы ў пасляваеннай Італіі, з'яўленню Хрысціянска-дэмакратычнай партыі, узаемадачыненняў палітычных сіл у вызначаны перыяд прысвечана дастаткова вялікая колькасць даследаванняў С.І. Васільцова, Л. Іаўчука, Ю.П. Лісоўскага, Л.М. Мітрохіна, К. Халадкоўскага, Я. Токаравай, Р.С. Філатава, М.С. Шаронава [15], [16], [17], [4], [6], [18], [19], [13], [20], [21].

Сярод літаратуры, якая раскрывае дзейнасць свецкіх каталіцкіх арганізацый, сацыяльную дактрыну каталіцызму, што хутка змянялася пад уплывам новых працэсаў у сацыяльна-эканамічным жыцці італьянскага грамадства, каталіцкія прафсаюзы, асаблівай увагі заслугоўваюць працы К. Канеўскага, Т.Б. Коваль, М.А. Кавалеўскага, Д.Г. Ларыёнава, Н.Н. Паташынскай, Я. Токаравай, К. Халадкоўскага [22], [23], [24], [25], [26], [9], [27], [28].

Працы савецкіх гісторыкаў збольшага былі прысвечаны агульнай праблематыцы гісторыі каталіцкай царквы і яе ролі ў развіцці краін Заходняй Еўропы і свету. Палітыка Ватыкана ў гады Другой сусветнай вайны і ў пасляваенныя дзесяцігоддзі жорстка крытыкавалася, а дзейнасць каталіцкай царквы пераважна асвятлялася ў плане адносін Святога пасаду да атэістычнага матэрыялізму і левых партый і рухаў. У якасці прыкладу можна прывесці працы ленінградскага гісторыка У.І. Рутенбурга 1950–1960-х гг., даследванні М.М. Шэйнмана. У кнізе «Ватыкан – цэнтр рэакцыі і цемрашальства», апублікаванай пад імем У.І. Волгіна, ён пісаў: «Карлікавая дзяржава папы рымскага не заслужвала б увагі, калі б яе дзейнасць абмяжоўвалася сценамі ватыканскай крэпасці. Аднак Ватыкан – гэта як бы галава атрутнага каталіцкага спрута, які спрабуе працягнуць свае шчупальцы ва ўсе куткі зямнога шара» [29, с. 136]. А ў артыкуле «Клерыкальная гістарыяграфія – зброя імперыялізму» працягваў: «Царква, як верны памочнік капіталізму, шукае спосабы затармазіць развіццё свядомасці працоўных, перапыніць шлях... народаў да сацыялізму» [30, с. 103]. Падобным па тэматыцы і па змесце з’яўляецца даследаванне М.М. Шэйнмана «Ватыкан у гады Другой сусветнай вайны», дзе казалася: «Страх перад рэвалюцыйным рухам у краінах Еўропы, нянавісць да ідэй камунізму і да Савецкай Расіі – усё гэта пасля Першай сусветнай вайны зрабіла Ватыкан і вярхушку каталіцкай царкоўнай арганізацыі саюзнікамі фашызму ў Італіі і Германіі...» [31, с. 2]. Знешнепалітычныя дзейнасць Ватыкана тлумачылася часта ў кантэксце «імперыялістычнай палітыкі». Ілюстрацыяй гэтага можа стаць яшчэ адно даследаванне М.М. Шэйнмана «Хрысціянскі сацыялізм» і кніга І.Р. Грыгулевіча «Папства. Стагоддзе XX» [32, с. 18].

Беларуская гістарыяграфія была прадстаўлена шэрагам прац, якія разглядалі агульныя пытанні гісторыі Ватыкана ці праблематыку каталіцкай царквы ў Беларусі [23], [33], [34].

Ускосным чынам тэма ролі каталіцкай царквы ў грамадска-палітычным жыцці Італіі разглядалася ў шэрагу артыкулаў і манаграфій па гісторыі Хрысціянска-дэмакратычнай партыі і рабочага руху ў Італіі ў перыяд пасля фашысцкага дваццацігоддзя. Да такіх прац адносяцца даследаванні А. Красікава [35], М.В. Андрэева [36], [37] і інш. Гэтыя работы адрозніваюцца класавым падыходам да гісторыі царквы і рэлігіі, характэрным для савецкай навуковай літаратуры тых часоў.

Непасрэдна закранаюць дадзены перыяд працы Н.Н. Паташынскай [38], [26], М.А. Кавальскага [39], [24], [40], [41], Ю.П. Лісоўскага [4]. Але з-за вызначанага тэматычнага кірунку (аўтараў цікавіць у першую чаргу рабочы і камуністычны рух Італіі) значныя пласты дзейнасці італьянскіх каталікоў выпалі з поля зроку гэтых даследчыкаў. Такі ж недахоп мае і даследаванне К.Г. Халадкоўскага «Працоўны рух у Італіі (1959–1963)» [27], якое аналізуе жыццё прафсаюзаў краіны напярэдадні рашэнняў II Ватыканскага сабора. Аўтар прысвячае апісанню каталіцкага кірунку ў італьянскім працоўным руху зусім мала ўвагі, аргументуючы гэта тым, што «няправільна перабольшваць ўплыў каталіцкай ідэалогіі на працоўны клас», бо «уплыў рэлігіі, царквы ў сучаснай Італіі нашмат слабейшыя, чым некалькі дзесяцігоддзяў назад» [27, с. 37].

Ускосна закранаецца тэма месца каталіцкай царквы ў палітычным жыцці Італіі ў працах гісторыка Р. Філатава, які прысвяціў свае даследаванні пытанням італьянскага фашызму і неафашызму [42], [43], [11], [12], [13]. У сваёй кнізе «Крах італьянскага фашызму» [12] аўтар разглядае прычыны таго, чаму фашызм у Італіі упаў задоўга да заканчэння Другой сусветнай вайны. Вялікая ўвага нададзена ўзброенаму Супраціўленню і кіраўнікам антыфашысцкай барацьбы. Праблема неафашызму ў пасляваеннай Італіі аналізуецца ў працах «Фашызм, неафашызм і антыфашысцкая барацьба ў Італіі» [13] і «Дэмакратычныя сілы Італіі супраць фашызму» [42]. У гэтых даследаваннях вучоны разглядае тыя фактары, якія дазволілі фашысцкаму руху часткова аднавіцца пасля заканчэння Другой сусветнай вайны і ператварыцца ў пастаянны фактар палітычнай нестабільнасці ў краіне. Адначасова ў кнігах паказаны механізмы барацьбы супраць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

неафашысцкай небяспекі, арганізацыі антыфашысцкіх сіл для абароны пазіцый, заваяваных яшчэ ў ходзе Супраціўлення.

Праблемы каталіцкай царквы і каталіцкага руху ў гады Супраціўлення разглядаюцца ў даследаваннях Н.П. Камолавай [1], [2], [44], [45], [3] і Б.Г. Лапухова [5].

У канцы 1980-х–1990-х гг. з'явіліся працы, прысвечаныя аналізу ролі і месца каталіцкай царквы ў палітычным і грамадскім жыцці розных краін Еўропы і свету. Прыкладам такіх дасладванняў можна назваць работы С.Б. Філатава «Каталіцкая царква ў грамадска-палітычным жыцці ЗША (70–80-ыя гады)» [14], З. Тышкевіча «Каталіцкая царква ў Польшчы 80 – пач.90-х гг. (сацыяльна-палітычны аспект)» [46] і інш.

У 1989 г. выйшла праца С.М. Пшызавай «Каталіцкая царква і працоўны рух у Італіі ў 80-я гг.» [47]. Як вынікае з назвы, даследчыцу цікавіла ў першаю чаргу праблема ўзаемаадносін каталіцкай царквы і працоўнага руху, высвятленне перадпасылак і ўмоў сумеснай барацьбы вернікаў і нявернікаў, каталіцкіх і прафсаюзных арганізацый у 1980-ыя гг.

Сучасная расійская гістарыяграфія прадстаўлена працамі Т. Зонавай [48], Я. Токаравай [19], [49], [9], В.Я. Язьковай [32] і інш. З'яўленню даследаванняў, прысвечаных гісторыі каталіцкай царквы ў ХХ ст., спрыялі перш за ўсё палітычныя і ідэалагічныя змены ў краіне, якія далі ў пачатку 1990-х гг. новыя магчымасці для расійскіх даследчыкаў. Для навуковай працы сталі даступны матэрыялы расійскіх архіваў, а таксама не толькі апублікаваныя заходнееўрапейскімі даследчыкамі дакументы і даследаванні, але і еўрапейскія нацыянальныя архівы.

У кнізе Я. Токаравай «Фашызм, царква і каталіцкі рух у Італіі (1922–1943 гг.)» даецца комплексная карціна становішча царквы і свецкіх каталіцкіх арганізацый у Італіі ва ўмовах фашысцкай дыктатуры. Падрабязна разглядаецца так званае «рымскае пытанне», нявырашанасць якога штурхнула царкву на падпісанне Латэранскіх пагадненняў у 1929 г. Аналізуючы адносіны рэжыму Мусаліні і Ватыкана, даследчыца акцэнтуе ўвагу на тым, што ў канчатковым выпадку фашызму «не ўдалося падначаліць царкву і ўключыць яе ў сваю палітычную сістэму» [9, с. 8], а роля і ўплыў каталіцкага руху ў Італіі прадстаўлялі сабой адзін з тых даволі значных фактараў, якія не толькі вялі да аслаблення фашысцкага рэжыму, але і прадвызначылі пасля Другой сусветнай вайны поспех Хрысціянска-дэмакратычнай партыі» [9, с. 9].

Канцэпцыя кнігі істотна адрозніваецца ад ранейшага асвятлення гісторыі Ватыкана часоў пантыфікату Пія XII. Праца заснаваная на вялікім дакументальным матэрыяле, узятым, што асабліва важна, з італьянскіх архіваў. Вывучэнне гэтых матэрыялаў дазволіла Я. Токаравай даць станоўчую характарыстыку дзейнасці Пія XII і паказаць яго бліскучым дыпламатам і багасловам, які зрабіў вялікі ўнёсак у сацыяльнае вучэнне каталіцкай царквы.

У кнізе Я. Токаравай разглядаюцца і дыскусіі вакол пазіцыі Пія XII ў адносінах да Халакосту. Аўтар не пагаджаецца з распаўсюджаным абвінавачваннем пантыфіка ў сімпатыях да нацыстаў. Даследчыца сцвярджае, што Папе прыходзілася ў першую чаргу асцерагацца больш жорсткіх праследаў мірнага насельніцтва, якія магла выклікаць адкрытая крытыка фашысцкага рэжыму. У той жа самы час Ватыкан, які валодаў вялікімі сродкамі і сусветнымі сувязямі, аказваў усялякую дапамогу ахвярам нацызму. Пазіцыя Святога пасаду, якая часта называецца «публічным маўчаннем», была, як лічыць аўтар, выклікана выключна тагачаснымі акалічнасцямі.

Сферай навуковых інтарэсаў яшчэ аднаго сучаснага расійскага аўтара Т. Зонавай з'яўляецца галіна сусветнай палітыкі. Яе ўвагу прыцягваюць праблемы царкоўнай дыпламатыі, а таксама дыпламатыі Італіі. У сваёй кнізе «Дыпламатыя Ватыкана ў кантэксце еўрапейскай палітычнай сістэмы» [48] Т. Зонава аналізуе гісторыю барацьбы Святога пасаду за ўплыў на каталікоў усяго свету. Аўтар прасочвае галоўныя этапы гэтай барацьбы на працягу стагоддзяў, падкрэсліваючы, што папская дзяржава была актыўнай палітычнай сілай у Заходняй Еўропе і аказвала ўплыў як на ўсю сістэму еўрапейскіх міжнародных адносін, так і на ўнутраную палітыку асобных краін кантыненту.

У 2009 г. з'явілася даследаванне В.Я. Язьковай «Царква і дзяржава ў Італіі ў палітычнай канцэпцыі К.Б. Кавура», дзе аўтарам аналізуецца фарміраванне канцэпцыі царквы і дзяржавы ў творах выдатнага палітычнага дзеяча XIX ст. К.Б. Кавура, які быў старшынёй Савета міністраў Сардынскага, а пазней і Італьянскага каралеўства [50]. Аўтар

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

падкрэслівае важнасць для Італіі пытання па размежаванні кампетэнцый царквы і дзяржавы на розных этапах існавання гэтай краіны. Таму сваю працу В.Я. Язькова прысвячае вывучэнню тэарэтычных і практычных асноў розных мадэлей узаемаадносін царквы і дзяржавы (акцэнтуючы ўвагу на ліберальнай мадэлі).

Яшчэ адзін сучасны расійскі гісторык С.У. Конараў цікавіўся пытаннямі ўзаемаадносін каталіцкай царквы і дзяржавы на прыкладзе Бразіліі. У яго дысертацыйным даследаванні было адлюстравана змяненне сацыяльнай ролі каталіцкай царквы і яе ўплыву на грамадска-палітычныя праблемы Бразіліі ў перыяд ад пачатку вайсковага перавароту 31.03.1964 г. да пераходу да грамадзянскага кіравання ў студзені 1985 г. [51].

З пачаткам 1990-х гг. наступае новы этап і ў беларускай гістарыяграфіі, звязаны з вывучэннем каталіцкай царквы. З'яўляюцца даследаванні, якія спрабуюць па-новаму разгледзець шырокае кола праблем гісторыі каталіцызму. Аднак па-ранейшаму цікаўнасць беларускіх даследчыкаў накіравана ў першую чаргу на вывучэнне беларускай праблематыкі. Роля «каталіцкага» фактару ў гісторыі Беларусі на розных этапах развіцця адлюстравана ў працах А.І. Ганчара, Э.С. Ярмусіка, Т.Б. Коваля і інш. [52], [53], [54].

Сярод прац сучасных беларускіх навукоўцаў, прысвечанных дзейнасці каталіцкай царквы па-за межамі Беларусі, можна прывесці даследаванне Д.Г. Ларыёнава «Сучасная сацыяльная дактрына Каталіцкай царквы і яе адаптацыя ва умовах Лацінскай Амерыкі» [25].

Падводзячы вынікі, можна сказаць, што ў рускамоўнай навуковай літаратуры ў той ці іншай ступені разглядаюцца асобныя пытанні, звязаныя з месцам і роляй каталіцкай царквы ў грамадска-палітычным жыцці Італіі 1943–1962 гг. Пры гэтым, савецкая гістарычная літаратура ўдзяляла мала ўвагі разгляду пазіцыі вышэйшага каталіцкага духавенства падчас Другой сусветнай вайны, дзейнасці царквы ў пасляваенныя гады, станаўлення, ролі і месца ў палітычнай сістэме краіны Хрысціянска-дэмакратычнай партыі; не ацэньвала ў поўнай ступені значнасць хрысціянскага Супраціўлення; перабольшвала, нягледзячы на канфармізм Ватыкана з фашысцкім рэжымам, прафашысцкую пазіцыю асобных колаў духавенства. З 1990-х гг. пачаўся новы этап вывучэння гісторыі і палітыкі каталіцкай царквы на заключным этапе Другой сусветнай вайны і ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі: сучасная беларуская і расійская гістарыяграфія ўзбагацілася даследаваннямі, якія па-новаму трактуюць дзейнасць Ватыкана ў пасляваенным свеце.

## Літаратура

1. Комолова, Н.П. Борьба течений в историографии итальянского движения Сопротивления / Н.П. Комолова // Новая и новейшая история. – 1965. – № 1. – С. 155–156.
2. Комолова, Н.П. Движение Сопротивления в Западной Европе / Н.П. Комолова. – М. : Наука, 1999. – С. 221.
3. Комолова, Н.П. Новейшая история Италии / Н.П. Комолова. – М. : Просвещение, 1970. – 319 с.
4. Лисовский, Ю.П. Италия от фашизма к демократии: Трудные пути послевоенной перетройки / Ю.П. Лисовский. – М. : Наука, 1990. – 385 с.
5. Лопухов, Б.Р. История фашистского режима в Италии / Б.Р. Лопухов. – М. : Наука, 1977. – 296 с.
6. Любин, В.П. Социалисты в истории Италии. ИСП и её наследницы (1892–2006) : авторе. дисс. ... д-ра ист. наук : 07.00.03 / В.П. Люблин. – М. : ИВИ РАН, 2007. – 34 с.
7. Нестеров, А.Г. Итальянская Социальная Республика и Ватикан: республиканский фашизм и католическая церковь / А.Г. Нестеров // Известия Уральского государственного университета. – 2004. – № 29. – С. 104–109.
8. Смирнова, А. Папа Пий XII и фашизм / А. Смирнова // Агх. – 2003. – № 1. – С. 83–85.
9. Токарева, Е. Фашизм, церковь и католическое движение в Италии (1922–1943 гг.) / Е. Токарева. – М. : ИВИ РАН, 1999. – 366 с.
10. Устрялов, Н.В. Итальянский фашизм / Н.В. Устрялов – М. : Вузовская книга, 1999. – 192 с.
11. Филатов, Г.С. Итальянские коммунисты в движении Сопротивления / Г.С. Филатов. – М. : Мысль, 1964. – 224 с.
12. Филатов, Г.С. Крах итальянского фашизма / Г.С. Филатов. – М. : Наука, 1972. – 492 с.
13. Филатов, Г.С. Фашизм, неофашизм и антифашистская борьба в Италии / Г.С. Филатов. – М. : Наука, 1984. – 382 с.
14. Филатов, С.Б. Католическая церковь в общественно-политической жизни США (70–80-ые годы) : автореф. дисс. ... канд. ист. наук : 07.00.03 / С.Б. Филатов. – М. : АН СССР. – 21 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

15. Васильцов, С.И. Рабочие партии и выборы в Италии (1953–1976 гг.) / С.И. Васильцов. – М. : Наука, 1978. – 262 с.

16. Васильцов, С.И. Структура избирательного корпуса рабочей партии Италии (1953–1972 гг.) / С.И. Васильцов. – М. : Наука, 1972. – 29 с.

17. Иовчук, Л. Социальные основы эволюции ИСП / Л. Иовчук // Социально-политические сдвиги в странах развитого капитализма. – М. : Наука, 1971. – С. 301–330.

18. Митрохин, Л.Н. Диалог марксистов с христианами / Л.Н. Митрохин. – М. : Знание, 1974. – 63 с.

19. Токарева, Е.С. Идейные и политические истоки Христианско-демократической партии Италии (1934–1943) / Е.С. Токарева // Религия и церковь в западном обществе XX в. – М. : Рос. АН, 1992. – С. 41–80.

20. Холодковский, К. Основные линии развития партийно-политической структуры Италии / К. Холодковский // Социально-политические сдвиги в странах развитого капитализма. – М. : Наука, 1971. – С. 253–300.

21. Шаронов, М.С. Коммунисты и католики в Италии. Из истории диалога (1921–1956) / М.С. Шаронов. – М. : Наука, 1973. – 359 с.

22. Каневский, К. Социальная доктрина Католической церкви / К. Каневский // Российская юстиция. – 2003. – № 6. – С. 66–71.

23. Кирюшин, П.М. Ватикан на службе реакции / П.М. Кирюшин. – Мн. : Изд–во Акад. наук БССР, 1950. – 165 с.

24. Ковальский, Н.А. Католики и мировое социальное развитие / Н.А. Ковальский. – М. : Наука. 1974. – 183 с.

25. Ларионов, Д.Г. Современная социальная доктрина католической церкви и ее адаптация в условиях Латинской Америки : автореф. дисс. ... канд. ист. наук : 07.00.03 / Д.Г. Ларионов. – Мн. : БГУ, 2003. – 22 с.

26. Поташинская, Н.Н. Католическая церковь и рабочее движение в Италии / Н.Н. Поташинская. – М. : Наука, 1979. – 255 с.

27. Холодковский, К.Г. Рабочее движение в Италии (1959–1963) / К.Г. Холодковский. – М. : Наука, 1969. – 399 с.

28. Холодковский, К.Г. Эволюция массового социально-политического сознания трудящихся Италии (1945–1985 гг.) : автореф. дисс. ... д-ра ист. наук : 07.00.02 / К.Г. Холодковский. – М., 1988. – 33 с.

29. Рутенбург, В.И. Ватикан в прошлом и настоящим / В.И. Рутенбург. – Ленинград : Лениздат, 1955. – 167 с.

30. Рутенбург, В.И. Клерикальная историография – орудие империализма / В.И. Рутенбург // Вопросы истории. – 1962. – № 3. – С. 103–113.

31. Шейнман, М.М. Ватикан во Второй мировой войне / М.М. Шейнман. – М. : АН СССР, 1951. – 352 с.

32. Шейнман, М.М. Христианский социализм / М.М. Шейнман. – М. : Наука, 1969. – 315 с.

33. Курносов, А.П. Католическая церковь – идеологический защитник господства помещиков и буржуазии в Западной Белоруссии (1919–1939) : автореф. дисс. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / А.П. Курносов. – Мн. : АН БССР, 1969. – 27 с.

34. Мараш, Я.Н. Ватикан и католическая церковь в Белоруссии (1569–1795) / Я.Н. Мараш. – Мн. : Вышэйшая школа, 1971. – 272 с.

35. Красиков, А.А. Ватикан: история и современность / А.А. Красиков. – М. : Советская Россия, 1991. – 62 с.

36. Андреев, М.В. Католицизм и основные проблемы современности / М.В. Андреев. – М. : Знание, 1973. – 64 с.

37. Андреев, М.В. Католицизм и проблемы современного рабочего и национально-освободительного движения / М.В. Андреев. – М. : Мысль, 1968. – 343 с.

38. Поташинская, Н.Н. Католический клерикализм и народные массы / Н.И. Поташинская. – М. : Наука, 1971. – 290 с.

39. Ковальский, Н.А. Ватикан и мировая политика / Н.А. Ковальский. – М. : Международные отношения, 1964. – 268 с.

40. Ковальский, Н.А. Справился ли католицизм с вызовами XX в.? / Н.А. Ковальский // Новая и новейшая история. – 1999. – № 6. – С. 27–38.

41. Ковальский, Н.А. Католицизм и международные отношения / Н.А. Ковальский, И.М. Иванова. – М. : Международные отношения, 1989. – 268 с.

42. Филатов, Г.С. Демократические силы против неофашизма / Г.С. Филатов. – М. : Мысль, 1977. – 174 с.

43. Филатов, Г.С. Журнал по истории итальянского движения Сопротивления / Г.С. Филатов // Новая и новейшая история. – 1962. – № 4. – С. 133–145.

44. Комолова, Н.П. Движение Сопротивления и политическая борьба в Италии / Н.П. Комолова. – М. : Наука, 1972. – 444 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

45. Комолова, Н. Классовые бои в итальянской деревне / Н. Комолова. – М. : Изд. АН ССР, 1963. – 343 с.

46. Тышкевич, З. Католическая церковь в Польше 80 – нач. 90-х гг. (социально-политический аспект) : автореф. дисс. ... канд. филос. наук : 09.00.06; 09.00.11 / З. Тышкевич. – М. : Российская академия управления, 1992. – 18 с.

47. Пшизова, С.Н. Католическая церковь и рабочее движение в Италии в 80-е гг : автореф. дисс. ... канд. ист. наук : 09.00.02 / С.Н. Пшизова. – М. : МГУ. – 25 с.

48. Зонова, Т.В. Дипломатия Ватикана в контексте эволюции европейской политической системы / Т.В. Зонова. – М. : РОССПЭН, 2000. – 200 с.

49. Токарева, Е. Латеранские соглашения 1929 г. в итальянской историографии и публицистике / Е. Токарева // История и историки. – М., 1987. – С. 157–175.

50. Язькова, В.Я. Церковь и государство в Италии в политической концепции К.Б. Кавура : автореф. дисс. ... канд. ист. наук : 07.00.03 / В.Я. Язькова. – М. : РАН, 2003. – 24 с.

51. Конорев, С.В. Бразильская католическая церковь в период правления военного режима (1964–1985) : автореф. дисс. ... канд. ист. наук : 07.00.03 / С.В. Конорев. – Иваново : Ивановский государственный университет, 2002. – 26 с.

52. Ганчар, А.И. Римско-католическая церковь в Беларуси (вт. пол. XIX – нач. XX вв.) / А.И. Ганчар. – Гродно : ГГАУ, 2010. – 510 с.

53. Ярмусик, Э.С. Римско-католическая церковь в Беларуси (1939–1991) : автореф. дисс. ... д-ра ист. наук : 07.00.02 / Э.С. Ярмусик. – Мн. : БГУ, 2009. – 45 с.

54. Коваль, Т.Б. Социальное учение католицизма о собственности и богатстве / Т.Б. Коваль // Новая и новейшая история. – 2009. – № 5. – С. 83–94.

Белорусский государственный университет

Поступила в редакцию 17.11.2016

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ